рону Фридриха II. Сицилийского короля поддержал и папа Иннокентий III. Это привело к падению могущества Оттона IV. В 1211 г. Фридрих II воссел на императорском троне и вполне быстро усилил свою власть. Пршемыслу Отакару I дал большие привилегии в знак благодарности – известную Золотую буллу сицилийскую.

В этом документе закреплены принципы отношений между Священной Римской империей и Чешским королевством. Золотая булла подтверждала наследственность титула чешского короля, к полномочиям которого относились вопросы инвеституры епископов, право чешской знати самой выбирать правителя на случай окончания династии, булла подтверждала законность неделимости территории королевства. Обязанности чешского короля относительно империи были несущественными и сводились к участию в императорских сеймах и римской коронации. Золотая булла признавала независимость Чешского государства и авторитет его правителя (Codex II, 1912, s. 37-38.).

Таким образом, в конце XII – первых десятилетиях XIII веков германо-чешские отношения постепенно развивались от вассальных к суверенным. В личности Пршемысла Отакара I чехи вновь обрели сильного правителя, который, умело используя противостояние между Штауфенами и Вельфами, сумел укрепить международный статус своего государства: в 1198 году он получил наследственный королевский титул от Филиппа Швабского, в 1203 году – разрешение на епископскую инвеституру от Оттона IV, которая подтверждала и расширяла прежние привилегии, в 1216 – признание примогенитуры, права, какого к тому времени не имел ни один немецкий княжеский род. Тем самым Пршемысл Отакар I добился внутренней независимости Чехии и Моравии от Священной Римской империи.

Гуса В. История Чехословакии. – Прага, 1963. – С. 56.

Декреталий "Venerabilem" Инокентия III впользу Оттона IV (март 1202 года) // Хрестоматия памятников феодального государства и права стран Европы / Под ред. акад. В.М. Корецкого. – М., 1961.

Егер О. Средние века (Всемирная история, т. 2). – СПб., 1997.

История Польши. – М., 1954. – Т. I.

История Чехии. /Под ред. акад. В.И. Пичеты. – М., 1947.

История Чехословакии. – М., 1956. – Т.I.

Колесницкий Н.Ф. "Священная Римская империя": притязания и действительность.

Коротка історія Угоршини. – Нiредьгаза, 1997.

Краткая история Чехословакии. С древнейших времен до наших дней. – М., 1988.

Лозинский С.Г. История папства. 3-е изд. – М., 1986.

Пако М. Фридрих Барбаросса. – Ростов-на-Дону, 1998.

Пристер Е. Краткая история Австрии. – М., 1952.

Рыжков К. Все монархии мира. Западная Европа (Энциклопедия). – М., 1999.

Чехія и Моравія. Издание Славянского благотворительного комитета. – СПб., 1871.

Vaniček V. Strukturálnyrysy českých středovekých dějín jako dějin evropských // Velké dějiny malí národ. O dnešni ceské státnosti a o současném odkazu velkých zemi České koruny a československé řepubliky. – Český spisovatel, 1995.

Codex diplomaticus et epistolaris regni Bogemiae II, ed. G. Fridrich. – Praha 1912.

Přehled dějin Československa I/1 [do roku 1526]. – Praha, 1980.

Tisic let česko-německych vztahů. Institut pro stredoevropskou kulturu s politiku, 1991.

## ПРАБЛЕМА "СІЛЕЗСКАГА КАЛІДОРУ" Ў ПАЛІТЫЦЫ ЕЎРАПЕЙСКІХ ДЗЯРЖАЎ (1721 – 1764 ГГ.).

А.У.Мацук

*г.Мінск, Інстытут гісторыі АН Беларусі*

У гісторыі шмат цікавых і непазнаных старонак. З-за іх няведання нельга ўявіць поўную, дасканалую карціну адбыўшыхся падзей. Так здарылася і з пытаннем аб сілезскім калідоры ў адносінах Саксоніі з Рэччу Паспалітаю (надалей РП) і іншымі еўрапейскімі

краінамі з 1721 па 1764 гг. Адзначым, што ў гэты час пытанне аб сілезскім калідоры з'яўлялася вядучым рухавіком у саксонскай палітыцы адносна РП і ўвогуле на міжнароднай арэне.

Нажаль ні ў польскай, ні ў нямецкай, ні ў беларускай, ні ў украінскай гістарыяграфіі няма спецыяльнай працы, прысвечанай дадзенаму пытанню. Больш таго, ніводны з аўтараў, акрамя Юзафа Героўскага [1, с.520], не надае вялікай увагі пытанню аб сілезкім калідоры, як адной з асноўных умоў для ўтрымання уніі Саксоніі і РП.

Пачынаючы з 1697 г. РП знаходзілася ў дынастычнай уніі з Саксоніяй. Такая акалічнасць стварала своесаблівае становішча. Саксонія мела права фактычна легальна праводзіць праз караля свае геапалітычныя інтарэсы ў РП. Для гэтага польскія каралі (адначасова курфюрсты саксонскія) выкарыстоўвалі права надання дзяржаўных пасадаў і зямель. Дакладна вядома, што Аўгуст II ужо напачатку свайго праўлення пачаў раздаваць пасады не заможным магнатам, а шляхце, чым шчыльна звязваў тую з саксонскім дваром [2, с.18]. І толькі патрэба падтрымкі з боку магнатэрыі падчас Паўночнай вайны вымусіла яго адмовіцца ад такой палітыкі.

Аднак РП мела і свае геапалітычныя інтарэсы, якія не супадалі, а месцамі і пярэчылі, саксонскім. Акрамя таго і Аўгуст II і Аўгуст III марылі зрабіць сваю ўладу спадчыннай, што выклікала моцную апазіцыю ў РП. Саксонскія дынастычныя і дзяржаўныя інтарэсы пераплятаїіся і склалі адно цэлае. Прычым аб тым, што два гэтых чыннікі саксонскай палітыкі складалі адно цэлае, паказвае стаўленне тады дворскай партыі Фаміліі (назва магнацкай групоўкі Панятоўскіх і Чартарыйскіх) да заключэння саюзнай дамовы з Прусіяй. Яны не падтрымлівалі яе, бо лічылі шкоднай, менавіта для РП [3, с.233]. Не падтрымлівала саксонскіх дыпламатычных планаў і большасць прадстаўнікоў магнатэрыі і шляхты РП.

Сустрэўшы супраціў сваім планам, саксонскія курфюрсты сталі шукаць шляхі, каб падначаліць РП сваёй палітыцы. Пасля заканчэння Паўночнай вайны Аўгуст II вярнуўся да тых планаў, якія ён ўжо вылучаў у час вайны. Іх сутнасць заключалася ў падзеле РП паміж яе суседзямі: Прусіяй, Саксоніяй, Аўстрыяй і Расіяй [4, с.170]. Такія планы перыядычна з'яўляліся і надалей.

Аднак ён сутыкнуўся ў выкананні такога плана з супрацьдзеяннем і за межамі РП. Найбольш моцна супрацьстаяла планам Аўгуста III Расія. Пасля Паўночнай вайны расійскі ўплыў быў непараўнана большы саксонскага. Безумоўна, што Расія не была зацікаўлена ў падзеле РП, бо гэта азначала памяншэнне яе ўплываў на дадзеных тэрыторыях і ў рэгіёне ў цэлым.

Акрамя таго, саксонскі ўрад не мог разлічваць на перакідванне вайсковых аддзелаў з Саксоніі ў РП. Справа ў тым, што Саксонія і РП не мелі агульнай мяжы. Яны былі адрэзаны адна ад другой тэрыторыямі Сілезіі і Брандэнбургу. Такім чынам атрымалася, што трываласць персанальнай уніі паміж Саксоніяй і РП у значнай ступені залежала ад таго, ці ўдасца дамагчыся агульнай мяжы паміж краінамі. У час панавання Аўгуста II і Аўгуста III ідэя аб'яднання Саксоніі і РП шляхам далучэння часткі Сілезіі выйшла на першы план у саксонскай палітыцы.

Першыя падобныя спробы рабіў яшчэ Аўгуст II. У 1729 годзе падчас размоў з паслом аўстрыйскага імператара Шэкендорфам і прускім міністрам Грумбкавым аб аўстра-саксона-прускім саюзе Аўгуст II прапанаваў у якасці адной з яго ўмоў перадачу "часткі Сілезіі, злучаючую Саксонію і РП [5, с.122]. Са смерцю кіраўніка саксонскай палітыкі графа Флемінга і заменай яго былога намесніка і наступніка Мантэуфеля кіроўцам знешняй палітыкі курфюрства стаў былы пасол у Францыі граф Хойм [5, с.122]. Ён змяніў курс Саксоніі ад саюзу з Аўстрыяй і Прусіяй да сяброўства з Францыяй. Версаль, ідучы на саюз з Саксоніяй, праследваў свае ўласныя інтарэсы, якія невыпадалі з агульнай канвы французскай палітыкі ў адносінах да Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Толькі зараз на месца разгромленай у Паўночнай вайне Швецыі меркавалася Саксонія. Пры гэтым меркавалася яе ўзмацніць шляхам пераўтварэння ў саксона-сілезска-польскую дзяржаву. [5, с.124] Як бачна змяняліся знешнепалітычныя кірункі Саксоніі, але пытанне сілезскага калідору заставалася актуальным у яе знешняй палітыцы. Толькі нежаданне Францыі падтрымаць абсалютысцкія памкненні Аўгуста II у РП,якія ішлі насуперак інтарэсам цесця Людовіка XV, Станіслава Ляшчынскага, сарвалі саюз.

Тады граф Хойм прапанаваў, каб *Саксонія пры падтрымцы Францыі заняла Сілезію* і, такім чынам, ператварылася б у каралеўства, што служыла б французскім інтарэсам у Нямеччыне. За гэта саксонскі курфюрст быў згодны адмовіцца ад кароны РП на карысць *Станіслава Ляшчынскага*. Французы *адмовіліся* і ад такой прапановы, бо небяспадстаўна лічылі, што з захопам Сілезіі саксонскія апетыты працягнуцца і да РП. [5, с.192]

Акрамя таго, саксонскі ўрад увесь час быў вымушаны лічыцца з моцным уплывам Расіі ў РП. Яна амаль цалкам фінансавала ўсе антысаксонскія выступленні апазіцыянераў з ВКЛ. А сярод іх былі такія вядучыя прадстаўнікі магнатэрыі, як вялікі гетман літоўскі Л.Пацей, бабруйскі староста Я.Сапега, смаленскі біскуп Б.Гансеўскі, М.Агінскі [5, с.150]. Цікава, што гэтыя ж прадстаўнікі Вялікага княства ўхвалілі ідэю французскага пасла Манці аб падтрымцы на каралеўскую пасаду Станіслава Ляшчынскага [6, с.3].

Як бачым планам Аўгуста II адносна "сілезскага калідора" перашкодзіла дрэнная міжнародная сітуацыя: варожасць Аўстрыі, нейтралітэт Францыі, узмацненне Расіі і яе ўмяшанне ў справы РП. Да саксонскага ўрада прыйшло разуменне, што далучэнне часткі Сілезіі магчыма толькі пры спрыяльных міжнародных абставінах.

Найбольшую вастрыню пытанне аб сілезскім калідоры (тэрыторыя, якая злучала Саксонію з РП) набыло падчас вайны за "аўстрыйскую спадчыну". Ужо напачатку вайны Аўгуст III абяцае дапамогу Марыі Тэрэзіі "за частку Сілезіі, якая злучала б Саксонію з Польшчай" [7, с.32; 8, с.488]. У дадатак да гэтай тэрыторыі Аўгуст III жадаў яшчэ тытул караля Саксоніі [8, с.488; 9, с.39].

Марыя Тэрэзія адмовілася, шукаючы хутчэйшага прымірэння з Фрыдрыхам II. Спачатку яна прапанавала яму за мірную дамову Лімбург, Гельдэрн і 2 мільёны талераў [10, с.141]. Як бачна, гэта была спроба зноўку зарыентаваць Прусію на шыротную экспансію ў бок Нямеччыны. Аднак яна скончылася нічым. Тады Марыя Тэрэзія прапанавала чатыры княствы у Ніжняй Сілезіі [10, с.141]. Фрыдрых II захапіў ужо ўсю Сілезію і таму не жадаў абмяжоўвацца толькі гэтымі княствамі. Аўстрыя ў чарговы раз была вымушана звярнуцца да Саксоніі.

У выніку перамоў 11 сакавіка 1741 г. быў заключаны саюз паміж Аўстрыяй і Саксоніяй. Па ім Аўгуст III абяцаў вайсковую дапамогу супраць Прусіі за "сілезскі калідор" [7, с.172].

Перш за ўсё паспрабуем вызначыць дакладныя межы сілезскага калідора. Ёсць некалькі звестак якія дакладна паказваюць тыя тэрыторыі, што фарміруюць сілезскі калідор:

1) *княствы Глогаўскае і Жаганьскае* [10, с.194;

2) частка Сілезіі з Жэганем і Глогавам [7, с.143] (невядома ці супадаюць межы княстваў пералічаных у пункце 1);

3) частка Сілезіі з Глогавам, Жэганем і Яварам [7, с.471; 8, с.496];

4) частка Свідніцкага, Явароўскага, Глогаўскага княстваў [8, с.495];

5) частка Сілезіі з Глогавам, Жэганем, Свеебодзінам, Кроснам і Цыліхавам [11, с.207].

Заўжды ў тэрыторыю ўключаліся Глогаў, Жэгань. У гэтым няма нічога дзіўнага, бо, менавіта, яны напрасткі злучаюць тэрыторыі Саксоніі і РП. Астатнія землі толькі павялічвалі шырыню калідору.

Калі абвесці на мапе тэрыторыі, якія патрабаваў Фрыдрых II перад пачаткам вайны за "аўстрыйскую спадчыну" – герцагствы: Гегерндорф, Лігніц, Брыг і Валаў [12, с.318], то атрымліваецца, што пруская тэрыторыя ахоплівае з двух бакоў сілезскі калідор. Становіцца зразумелым, чаму Саксонія ціснула на Аўстрыю, каб тая не саступала іх Прусіі. Улічваючы абкружанасць Саксоніі прускімі землямі, далучэнне да Прусіі гэтых герцагстваў рабіла саксонскае курфюршаства і РП толькі аб'ектам у геастратэгічных схемах Фрыдрыха II.

Пашырэнне тэрыторыі калідору (гл. пункт 4) тлумачыцца тым, што яно меркавалася падчас сямігадовай вайны. У гэты перыяд у РП не было моцнай групоўкі, якая падтрымлівала планы саксонскай дынастыі.

Падчас вайны за "аўстрыйскую спадчыну" 1740-1745 г. шырыня калідора не была важнай, бо спадчынныя планы саксонскага курфюрста падтрымлівалі Чартарыйскія [13, с.108]. Такі саюз надаваў магчымасць пры пагрозе калідору перакідваць войскі з

Саксоніі ў ВКЛ і з ВКЛ у Саксонію. Магчымасць перакідвання войск дазваляла фактычна кантраляваць усю тэрыторыю РП, акрамя таго, абараняць дзяржаўныя межы ў выпадку нападу любога з суседзяў.

Такая структура дае нам магчымасць сцвярджаць, што Саксонія і Чартарыйскі ў сваіх геастратэгічных схемах прытрымліваліся шыротнай інтэграцыі. Прычым, саксонская улада і Фамілія даволі доўга ў сваёй палітыцы кіраваліся планам шыротнай інтэграцыі. Безумоўна, галоўная роля тут адводзілася Саксоніі, якая павінна была адыграць ролю геапалітычнага цэнтру ў мяркуемым утварэнні. У такім выпадку землі, якія знаходзіліся пад уплывам шляхецкай кліентэлы Фаміліі, ператвараліся ў перыферыі. Безумоўна, што такі стан рэчаў не мог задаволіць Чартарыйскіх. І гэтая супярэчнасць стала у далейшым адной з прычын іх абыякавага стаўлення да саксонскага імкнення набыць сілезскі калідор.

Яшчэ да пачатку вайны за "аўстрыйскую спадчыну" прадстаўнік групоўкі Чартарыйскіх Станіслаў Панятоўскі бараніў дынастычныя інтарэсы Вецінаў у Францыі. Акрамя таго, Фамілія пайшла на прымірэнне з прапрускай магнатскай групоўкай Пілавай (назва Патоцкіх ад іх родавага герба), бо імкнулася забяспечыць спакойную унутраную абстаноўку.

Садзейнічала планам Аўгуста III і Чартарыйскіх тое, што саюзнік Патоцкіх – Турцыя не магла аказаць ім дапамогу. Яна была занята вайной з Персіяй. Акрамя того, каб адцягнуць увагу Прусіі ад Сілезіі і ўзмацніць Чартарыйскіх, саксонскі пасол Герндорф прапанаваў напасці на Усходнюю Прусію. Падтрымліваў дадзеную ідэю польскі пасол Флемінг [14, с.372], які быў прадстаўніком Фаміліі.

Такое развіццё падзей вымушала Прусію і яе саюзніцу Францыю з 1743 па 1745 г. зрываць сеймы шляхам подкупу дэпутатаў (15000 дукатаў і 40000 талераў адпаведна) [11, с.237].

Цікава, што падчас заключэння аўстра-саксонскага саюзу ў 1743 годзе ўмовы недатычыліся якіх-небудзь тэрытарыяльных набыткаў. Аўстрыя толькі абяцала дазволіць прапусціць саксонскія войскі ў РП. Прычым падчас вайны іх колькасць была не абмежавана, а ў мірны час не болей 1400 чалавек [8, с.495]. Пры ажыццяўленні такой дамовы можна не сумнявацца ў павелічэнні ўплыву Аўстрыі на ўзаемадачыненні Саксоніі і РП. Аўстрыя магла смела выступаць у ролі абаронцы шляхецкіх вольнасцей перашкаджаючы, згодна дамовы, перакідцы саксонскіх войск у РП.

Разумеў гэта і Аўгуст III. Толькі дрэнная знешнепалітычная абстаноўка вымусіла яго пагадзіцца з такімі ўмовамі. Хаця перад заключэннем дамовы, у тым жа 1743 годзе, ён вылучаў галоўнай умовай яе заключэння атрыманне Саксоніяй шырокага сілезскага калідору з наступных княстваў: Свідніцкага, Явароўскага, Глогаўскага [8, с.495].

У наступным 1744 годзе ўвесь час працягваліся аўстра-саксонскія перамовы. Аўгуст III патрабаваў ужо сілезскі калідор з наступных княстваў: Яворскага, Глогаўскага, Жэганьскага. [7, с.471; 8, с.496] Аўстрыя была згодна адмовіцца ад абароны шляхецкіх вольнасцяў і згадзіцца на тэрытарыяльны калідор РП з Саксоніяй, але не за кошт сілезкіх, а прускіх земляў. Яна згаджалася на перадачу Саксоніі калідору за кошт прускай зямлі Любушскай – Кросна і Цыліхава [8, с.496].

Аўстрыя была вымушана пайсці на саступкі з-за дрэнных міжнародных абставінаў. Што гэта была часовая саступка, добра сведчыць перапіска аўстрыйскага пасла Эстергазі, які дрэнна адзываецца аб РП і выказвае незадавальненне патрабаваннем Саксоніяй "сілезскага калідору" [15, с.152].

Аднак вайна скончылася няўдала для Саксоніі і Аўстрыі, і таму іх планам ненаканавана было збыцца.

Напрыканцы вайны Францыя і Прусія, імкнучыся разарваць саксонска-аўстрыйскі саюз, прапанавалі курфюрсту Аўгусту III варыянт з іншым калідорам. Яны абяцалі яму частку Чэхіі і тракт праз Маравію і Сілезію да РП [8, с.499]. Яны добра разумелі, што Саксоніі патрэбен у першую чаргу калідор, злучаючы яе з РП. Такая прапанова, аднак, была горш за аўстрыйскую для саксонскага ўраду, бо тракт праз Маравію і Сілезію аказваўся абкружаным з усіх бакоў прускімі ўладаннямі. Фактычна ён падпадаў у залежнасць ад Прусіі, што давала той магчымасць яшчэ больш уплываць на ўзаемадачыненні Саксоніі і РП. Атрымлівалася, што анархія ўнутры РП кантралявалася б Прусіяй. Менавіта таму

Саксонія працягнула перамовы з Аўстрыяй. Па дамове 1745 года Аўстрыя абяцала падтрымку сыну Аўгуста II у элекцыі ў РП і вузкі калідор у Сілезіі [8, с.504].

Як бачна, няўдалы ход вайны вымусіў Аўстрыю шукаць падтрымкі ў Саксоніі і РП, паступова ідучы на саступкі планам Аўгуста III. Прычым за час вайны саступкі мелі вялікі характар: ад кантралявання ўзаемадачыненняў Саксоніі і РП да прадастаўлення незалежнага ад Аўстрыі сілезскага калідору, злучаючага іх, і абяцання дапамогі ў элекцыі сыну Веціна.

Больш за ўсіх выйграла ў вайне за "аўстрыйскую спадчыну" Прусія. Яе набыткі датычыліся і РП. Фрыдрых II пасля заканчэння вайны заявіў станам РП, што ён "выратаваў польскую вольнасць, не даўшы захапіць Саксоніі сілезскі калідор, які злучаў бы яе з РП". [15, с.165] Такімі сваімі дзеяннямі і прамовамі Фрыдрых II яшчэ больш схіліў да сябе апазіцыю ўладзе Аўгуста III у РП. Пасля захопу Сілезіі падчас вайны за "аўстрыйскую спадчыну", Фрыдрых II стаў сапраўдным абаронцам шляхецкай вольнасці ў РП. Яго саюзнікі там, Патоцкія, валодалі амаль усёй вайсковай уладай, асабліва ў КП. Яны ў любы момант маглі выступіць супраць улады Аўгуста III, небаючыся яго слабых вайсковых аддзелаў. Перакідка войск з Саксоніі была немагчыма, бо яе не дазволіў бы Фрыдрых II.

Здавалася, вось яна перамога апазіцыі і дамінацыя Прусіі. Аднак гэта быў бы спрошчаны погляд на становішча РП. Сам Фрыдрых II не быў зацікаўлены ў перамозе ў РП якой-небудзь з груповак магнатаў. Яго больш задавальняў стан пастаяннай барацьбы паміж сабой у РП, чым аслаблялася ўся дзяржава. Другую прычыну немагчымасці дамінавання Прусіі над усёй РП была пазіцыя Расіі. Апошняя не была задаволена ўзмацненнем Прусіі. Акрамя таго, пачынаючы з часоў Паўночнай вайны, яна мела аграмадны ўплыў на спрацыю ў РП. Аб гэтым кажа і сам Фрыдрых II [4, с.180]. Было зразумела, што Расія не згадзіцца на перамогу варожай ёй і прыхільнай Прусіі групоўкі магнатэрыі.

Ваганні падчас вайны за "аўстрыйскую спадчыну" саксонскага ўраду ад саюзу з Прусіяй да саюзу з Аўстрыяй тлумачыцца простай формулай: усё роўна з кім, галоўнае - далучыць частку Сілезіі.

Падзеі вайны за "аўстрыйскую спадчыну" садзейнічалі шчыльнаму збліжэнню Саксоніі і Чартарыйскіх з Расіяй. Збліжэнне тлумачылася агульнымі мэтамі. Для забеспячэння шыротнай інтэграцыі з дапамогай Расіі, саксонскі урад быў згодзен разглядаць варыянт перадачы якой-небудзь тэрыторыі на Украіне [9, с.47]. Меркавалася, што такім удалым ходам яна не толькі атрымлівала ўзброеную дапамогу супраць Прусіі, але і знішчала ворага шыротнай інтэграцыі ўнутры краіны. Больш таго, у дадатак існаваў план захопу Усходняй Прусіі. Такім чынам ўзмацнялася становішча Фаміліі і рабіўся больш прывабным яе саюз з Саксоніяй. Дадзенаму плану не было наканавана збыцца, бо скончылася вайна за "аўстрыйскую спадчыну".

Саюз Саксоніі з Чартарыйскімі быў магчымы толькі таму, што Аўгуст III цалкам давяраў Фаміліі распараджацца ва ўнутраных справах ВКЛ [16, с.25]. Чартарыйскія падтрымлівалі кандыдатуру яго сына Ксаверыя, як спадчынніка ў РП. Прычым, рабілі яны гэта і пасля заканчэння вайны, у 1752 г. Аднак пасля вайны яны падтрымлівалі Ксаверыя з-за актыўнасці рэспубліканцаў, якія з дапамогай Швецыі імкнуліся ўзняць канфедэрацыю. Другой прычынай, што вымушала Чартарыйскіх да саюза з Саксоніяй было ўмяшанне Прусіі ва ўнутраныя справы РП. Даходзіла да адкрытых пагрозаў, як на гродзенскім сейме 1752 г. Расія рэзка аступіла прускія гарачыя галовы. Яна заявіла, што "ў выпадку нападу Прусіі на Гановер ці іншую тэрыторыю прадпрыме ўзброенае ўмяшанне" [14, с.407].

Саксоніі і Фаміліі прыходзілася ўвесь час карэктаваць планы шыротнай інтэграцыі і свае саюзныя адносіны з Расіяй, улічваючы інтарэсы саюзніцы апошняй – Аўстрыі. Менавіта таму прыйшлося замяніць сілезскі калідор на тэрыторыю Брандэнбурга [10, с.183].

Саюз па шыротнай восі Саксонія–Фамілія–Расія быў нетрывалым і хутка распаўся. Такі ход падзей адбыўся з-за пазіцыі Чартарыйскіх. Гэты магнацкі род, адчуваючы моцную падтрымку Расіі, цешыўся надзеяй забяспечыць карону за сваім прадстаўніком. Для выканання дадзенага плану паслом у Пецярбург быў прызначаны Станіслаў Панятоўскі (сын), які павінен быў "забяспечыць адносіны паміж Літвой і Расіяй" [16, с.120] Чартарыйскія спадзяваліся выкарыстаць расійскую сістэму "прадполля" для здзяйснення ў РП унутраных рэформ. Такім чынам Расія захавала сувязь і з Фаміліяй, і з Саксоніяй пры адсутнасці саюза паміж імі.

Як бачна з усяго вышэй пералічанага саксонскія курфюрсты маглі самастойна ўзмацніць сваё становішча ў РП толькі з дапамогай сваіх войскаў. Аднак, ні Аўгуст II, ні Аўгуст III не маглі прывесці саксонскія войскі ў РП. Звязана гэта было з геапалітычнымі прычынамі. Саксонія і РП не межавалі. Паміж імі знаходзілася тэрыторыя Сілезіі, а тая належыла то Прусіі, то Аўстрыі.

Саксонская спадчынная манархія ў РП была магчымай толькі ў выпадку набыцця "сілезскага калідору". Так атрымалася,што з-за супрацьдзеяння іншых дзяржаў Саксонія аказалася не ў стане забяспечыць яго для сябе. Прычым усе яны не падтрымлівалі ўзмацнення саксонскай дынастыі ў РП і таму адмовілі ў падтрымцы планам па набыццю курфюрстамі Саксоніі "сілезскага калідору".

Шмат хто з папярэднікаў саксонскіх курфюрстаў на троне РП марыў аб заваёве Сілезіі, але толькі зараз гэтае пытанне было пастаўлена на першы план у знешняй палітыцы краіны. Менавіта яно і стала галоўнай прычынай пасля вайны за "аўстрыйскую спадчыну", што накіроўвала Саксонію і дворскую партыю РП да збліжэння з Аўстрыяй супраць Прусіі. Вынік такой палітыкі для Саксоніі вядомы – акупацыя прускімі войскамі падчас Сямігадовай вайны, а для РП – узмацненне ўмяшання Прусіі ва ўнутраныя справы з мэтай перашкодзіць любым планам, што маглі б несці ёй пагрозу. Ні Аўгуст II, ні Аўгуст III не маглі пры гэтым выкарыстаць усе сілавыя метады з боку курфюрства, бо не мелі агульнай мяжы з РП. Атрымалася, што Прусія пасля вайны за "аўстрыйскую спадчыну" заняла ў адносінах да РП тое ж становішча, што і Расія. Сэнс яго заключаўся ў перашкодзе правядзенню рэформ, бо яны маглі прынесці рэалізацыю сумесна з іншымі еўрапейскімі краінамі (напрыклад, Саксоніяй ці Аўстрыяй) шкоднай для іх знешняй палітыкі.

Няўдача рэалізацыі плана заваёвы сілезскага калідору стала прадвеснікам скančэння панавання саксонскай дынастыі ў РП.

1.Gierowski J. Stosunki polsko-auśtriackie w czasach saskich// Sobótka. – 1983 – №4. – C.517—526.

2.Porażinski J. Sejm lubelski w 1703 roku i ja miejscie w konfliktach wewnętrznych na pocyątki XVIII wieku. – Warszawa: PWN, 1988 – 139s.

3.Salmonowicz S. Prușy. Dzieje panstwa i spoleczenstwa. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 1987 – 618s.

4.Туполев Б. Фридрих II, Россия и первый раздел Польши// Новая и новейшая история. – 1997. – №5. – С. 168–196. – 347s.

5.Rostworowski E. O polska korone. Polityka Francji w latach 1725–1733. – Wrocław – Kraków: Ateneum, 1958. – 364s.

6.Мацук А.В. Война за «польское наследство» и образование «русской» партии в Великом княжестве Литовском. – Кровь. Порох. Лавры. Войны России в эпоху барокко (1700 – 1762). Вып.2. Санкт – Петербург, 2002. С.80 – 83.

7.Skibiński M. Europa a Polska w dobie wojny o suksecje austriacką, T.1. – Kraków: Akademia Umiejętności, 1912. – 844s.

8.Historia Śląska, T.3, cz.3. – Wrocław: PAN, 1963 – 626s.

9.Konopczyński W. Od Sobieskiego do Kosciuszki. Szkice drobiazgi fraszki historyczne. – Kraków: Druk Wi. L. Anczyca i Spolki, 1921 – 353s.

10.Кони Ф. Фридрих Великий. – Ростов на /Д.: Феникс, 1997. – 544с.

11.Konopczyński W. Polska w dobie wojny siedmioletniej,t.1. – Kraków, 1909. –296s.

12.Монархи Европы. Судьбы династий. – М.: Международные отношения, 1996. — 598с.

13.Прыбытка Г. Барацьба магнацкіх груповак у 18ст.//Спадчына. – 1996. – №1. – С.80–151.

14.Валишевский К. Дочь Петра Великого. – Ростов н/Д.: Феникс, 1998 – 544с.

15.Zielińska Z. Walka "Familii" o reforme Rzeczypospolitej, 1743 – 1752 – Warszawa: PWN, 1983 – 385s.

16.Понятовский С. Мемуары. – М.: Терра, 1995. – 365 с.